інтанацыя, якая ў вершах гукавога складу адыгрывае найважнейшую ролю ва ўспрыманні сэнсавых структурных частак верша: А. Сьнег неаднаразова папярэджвае чытачоў аб тым, што вершы павінны вымаўляцца “шэптам” – толькі так ствараюцца адпаведныя двухсэнсовасці закладзенага мыслення і атмасфера гарманічнага суіснавання ў рэальным, а таксама, створаным гукавой абалонкаю верша, ірацыянальным свеце.

### Літаратура


1. Дусь, Г. Парушаны рытм [Электронны рэсурс] / Г. Дусь. – Рэжым доступу: http://babruysk.by/ales-sneg-u-babrujsku-znikae-nefarmalnaya-kultura/. – Дата доступу: 18.03.2019.
2. Кіркевіч, А. Yёsць! Алесь Снег: “Я – вінцік у рухавіку беларускай культуры” [Электронны рэсурс] / А. Кіркевіч. – Рэжым доступу: http://budzma.by/news/yyosc-alyes-snyeh-ya-vincik-u-rukhaviku-byelaruskay-kultury.html. – Дата доступу: 18.03.2019.
3. Сьнег, А. Вершы [Электронны рэсурс] / А. Сьнег. – Рэжым доступу: https://vk.com/-snieg. – Дата доступу: 18.03.2019.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Рэпрэзентацыя праблемы “бацькі і дзеці” ў аповесці У. Ліпскага “Споведзь сына”

*Г. А. Лукашэвіч*
*БДПУ (Мінск)*
*Навук. кіраўн. – Н. В. Заяц, канд. філалаг. навук, дац.*

**Анатацыя.** На матэрыяле аповесці У. Ліпскага “Споведзь сына” даследуецца спецыфіка раскрыцця праблемы “бацькі і дзеці”. Паказваецца адметнасць пісьменніцкага почырку У. Ліпскага.

**Ключавыя словы:** У. Ліпскі; праблема “бацькі і дзеці”; сям’я; аповесць.

Беларускі пісьменнік Уладзімір Ліпскі вядомы найперш як аўтар, творчасць якога прызначана дзіцячай аўдыторыі. Яго кнігі “Сонца над галавой”, “Уліпкі”, “Мілаградскі конік”, “Споведзь сына” і іншыя вызначаюцца простай і даступнай мовай, шчырасцю і цеплынёй пачуццяў, глыбінёй думкі.

Праблемна-тэматычны дыяпазон твораў У. Ліпскага дастаткова шырокі: аўтара цікавяць праблемы роўнасці паміж людзьмі, узаемаадносін родных, тэма да роднага краю. Адзін з аспектаў яго мастацкага даследавання – праблема бацькоў і дзяцей, якая стала ключавой у аповесці “Споведзь сына” (2011).

Вынесянне ў загаловак жанравага вызначэння тэксту падкрэслівае яго інтымна-асабісты характар. Споведдзю прынята лічыць літаратурна-мастацкія творы або іх часткі, дзе апавяданне вядзецца ад першай асобы і апавядальнік упускае чытача ў самыя патаемныя глыбіні свайго ўнутранага свету. Блізкімі да споведзі лічацца такія жанры, як дзённік, аўтабіяграфія, раман у лістах. Нявымышленасць персанажаў і гісторый, факталагічная дакладнасць дазваляюць адносіць іх як да мастацкай, так і да мастацка-дакументальнай літаратуры.

У гісторыі сусветнага прыгожага пісьменства вядома нямала падобных твораў з назвай або падзагалоўкам “споведзь” – ад Дэні Дзідро да Ларысы Геніюш. Твор У. Ліпскага не губляецца на гэтым прадстаўнічым фоне літаратурных папярэднікаў, а ўносіць свой уклад у развіццё жанру. Яго споведзь вызначаецца падкрэсленай пачуццёвасцю і лірычна-ўзнёслай танальнасцю, што абумоўлена праблематыкай: выяўленне любові сына да бацькоў.

Твор прасякнуты цеплынёй да родных мясцін, людзей, а, галоўнае, любоўю да Мамы і Бацькі. Шанаваць радзіму, паважаць бацькоў, радавацца кожнаму новаму дню – творчы імператыў пісьменніка і ідэйна-мастацкі змест кнігі “Споведзь сына”. З першых старонак ствараецца ўражанне, што чытаеш свайго роду малітву, якая адлюстроўвае чысціню душы пісьменніка. Чытаючы гэту споведзь, мы нібы маем магчымасць гаварыць з аўтарам, даведваемся пра зносіны паміж роднымі ў сям’і Ліпскіх: “*А хто, думаю, даваў сілы маёй Маме? Калі сказаць, што яе муж Сцяпан, то будзе і не так. Ён усё жыццё мардаваўся, каб быў свой кут, а ў ім – цёпла і не галадна. Але ўжыцца з яго крутым характарам магла толькі Маня, мая цярплівая Мама*” [1, с. 94]. Жаданне пайсці да сваіх Мамы і Таты, прытуліцца да іх суправаджае ад першай старонкі да апошняй. Аўтару хочацца выказаць ім самыя цёплыя словы, падзяліцца тым, што баліць недзе ўнутры. Можа, У. Ліпскі і стварыў кнігу “Споведзь сына” для таго, каб падштурхнуць чытачоў бліжэй да самых родных людзей, каб нагадаць, што нельга крыўдзіцца на бацькоў, а трэба размаўляць з імі, дзяліцца радасцю і бядой, шаптаць ім словы любові, берагчы іх.

Праблема ўзаемаадносін “бацькоў і дзяцей” заўсёды з’яўлялася глабальнай. Гэта канфлікт двух пакаленняў, які, здаецца, ніколі не вырашыцца. Але знайсці тое, што можа аб’яднаць сям’ю, зрабіць адносіны лепшымі, можна. Трэба ўмець быць мудрымі, ласкавымі да тых, хто побач. У аповесці аўтар закранае праблему, звязанную з тым, як людзі, апынуўшыся ў вялікім горадзе, забываюць пра свае родныя мясціны: невялікія вёсачкі, маленькія гарадкі, дзе прайшло іх дзяцінства

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і юнацтва, дзе яны былі шчаслівыя. У. Ліпскі звяртае ўвагу на тое, што нельга цурацца сваіх каранёў і неабходна заўсёды памятаць, адкуль ты родам. “Шоўкавічы адкрылі мне свет, – зазначае Уладзімір Ліпскі. – Гэта незабыўна дарагія мясціны. Здаецца, што тут самыя шчырыя людзі. Мудрыя ад неба, багатыя ад зямлі, душэўныя ад божай прыгажосці, якой надзелены Шоўкавічы” [2].

“Споведзь сына” – гэта невыказаныя словы любові бацькам на нябёсы. Вобраз бацькоў ствараецца пры дапамозе пейзажных апісанняў: “*Мне заўсёды мроіцца, што Мама – сама Вясна*” [1, с. 10], – адзначыў У. Ліпскі, калі ствараў вобраз сваёй Мамы. Метафара вясны дапамагае пісьменніку перадаць усю тую любоў, з якой ён ставіўся да самага роднага чалавека.

Здаецца, немагчыма знайсці ў іншых пісьменнікаў столькі лагоднасці да бацькоў, якой поўніцца сэрца аўтара “Споведзі сына”. Яго Маці была непісьменная, але па-свойму святая для Уладзіміра Сцяпанавіча. Яна вучыла дзяцей мудрасцю, якой валодала, вучыла і любоўю: “*Веру, зямля была для мамы школай і ўніверсітэтам, вучыцелькай-мучыцелькай. Веру, зямля навучыла Маму жыць – карову даіць, авечак стрыгчы, мазалі зарабляць. Хто працуе на зямлі – і паэтычны, і багаты душой*” [1, с. 11].

З такой жа лірычнай інтанацыяй гаворыць пісьменнік і пра бацьку: “*Родны мой! Я ж не помню, каб ты калі-небудзь мілаваў мяне, лашчыў, абдымаў. Гэта, відаць, не ўваходзіць у этыкет Бацькі!*” [1, с. 230]. Стрыманасць пачуццяў, жорсткасць, няўменне палашчыць сваіх дзяцей – тыповыя характарыстыкі мужчыны, але ж за ўсім гэтым стаіць вобраз цярплівага, моцнага і сумленнага чалавека, што ўсім сэрцам любіць сваіх дзетак, жадае лепшай долі і гатовы аддаць “апошні кавалачак хлеба”, каб ім было лягчэй: “*Ты ж, бацька, па потнаму рублiку сабраў кожнаму са сваіх дзяцей па пяцьсот рублёў. Шэсць дробненькіх купюр, перакладзеных паперкамі, ляжалі пад падушкай, якой ты аддаў сваё апошняе прыжыццёвае цяпло. Я ведаў ім кошт. Я добра ўяўляю, як ты, абмяжоўваючы свае жаданні і хаценні, збіраў па рубліку свой капітал. Ты аддаў дзецям жыццё*” [1, с. 365].

Гэтыя людзі сапраўды святыя, такія, якімі бачыў іх пісьменнік. Такія, якія выконвалі сваю галоўную функцыю – сумленна выхоўваць нашчадкаў. Думаецца, што гэта задача ў Марыі Адамаўны і Сцяпана Іванавіча Ліпскіх атрымалася на “выдатна”, бо іх “апошненькі сынок” увекавечыў памяць, напісаўшы кнігу для тых, хто любіць і толькі вучыцца любіць, – “Споведзь сына”.

Такім чынам, традыцыйная літаратуразнаўчая праблема бацькоў і дзяцей вырашаецца ў аповесці У. Ліпскага “нетрадыцыйна”: пісьменнік акцэнтуе ўвагу не на сутыкненні пакаленняў, а паказвае тое, што ў кожным канфлікце можна заўсёды знайсці кропку судакранання. Аўтар “Споведзі сына” актуалізуе думку пра

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

скарабежнасць жыцця, бо нам здаецца, што жыццё доўгае і бацькі будуць побач з намі заўсёды. Але кожны чалавек сталее, пазбаўляючыся магчымасці быць звычайным дзіцём сваіх бацькоў, рэдка наведваецца ў госці ў свой дом, дзе ён нарадзіўся, пазнаў першую навуку жыцця, знайшоў вернага сябра і ўпершыню закахаўся. Аўтарская інтэнцыя У. Ліпскага, выказаная ў “Споведзі сына”, сугучная барадулінскаму “Трэба дома бываць часцей...”, і ў сцвярджэнні гэтай тэзы пісьменнік вельмі пераканаўчы.

## Літаратура


1. Ліпскі, У. С. Споведзь сына / У. Ліпскі . – Мінск : Харвест, 2011. – 512 с.
2. “Што раблю? – Жыццё люблю!” [Электронны рэсурс] // Уладзімір Ліпскі: сайт. – Рэжым доступу: http://www.lipskivs.by/lipski-biography.html. – Дата доступу: 22.02.2019.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Станаўленне гатычнай традыцыі ў еўрапейскай і беларускай літаратуры


*А. А. Макарушка*
*БДПУ (Мінск)*
*Навук. кіраўн. – М. С. Рак, выкладчык кафедры беларускай і замежнай літаратуры*



**Анатацыя.** У артыкуле вызначаюцца дамінантныя адметнасці гатычнага жанру ў еўрапейскай і беларускай літаратуры, разглядаецца станаўленне гатычнай традыцыі ў нацыянальным мастацтве слова.



**Ключавыя словы:** готыка; гатычная традыцыя; жанравая адметнасць; жах; таямніца; містыка.


Цікавасць чытачоў і пісьменнікаў да таемнага, містычнага, звышнатуральнага заўсёды была вядучай тэндэнцыяй, якая абумоўлівала станаўленне новых жанраў, з’яўленне новых твораў, адметнасць паэткі якіх заключалася якраз у квінтэсэнцыі жахлівага, незвычайнага, невытлумачальнага: “У гэтых творах настолькі моцныя рысы таямнічага і загадкавага, настолькі незвычайныя і казачныя апісанні, што яны ў значнай ступені дапамагаюць абудзіць ўсю моц ўяўлення, запоўніць вашу душу велічнымі і таямнічымі вобразамі” [3]. У еўрапейскай літаратуры готыка існуе больш за трыста гадоў, прапедэўтыкай яе станаўлення можна лічыць асобныя творы,